**12 лістапада 2025 г. - 55 гадоў з дня нараджэння Андрэя Міхайлавіча Гольцмана (1970), кіраўніка вытворчасці, Ганаровага грамадзяніна Кобрынскага раёна (2017)**



Андрэй Міхайлавіч Гольцман нарадзіўся 12 лістапада 1970 года ў г. Кобрыне Брэсцкай вобласці. Вучыўся ў сярэдняй школе №5 г. Кобрына.

Сваю працоўную дзейнасць пачаў у 1988 годзе мулярам Перасовачнай механізаванай калоны № 44 г. Кобрына. Затым служыў у Савецкай арміі.

Пасля заканчэння Брэсцкага політэхнічнага інстытута з 1994 года па 1996 год працаваў начальнікам аддзела збыту ТАА «Амега» г. Кобрына, з 1997 года па 1998 год - на пасадзе інжынера аддзела камплектацыі Кобрынскага прадпрыемства «Полесьеводстройкомплект».

У 1998 годзе А. М. Гольцман стварыў сумеснае вытворчае прадпрыемства з абмежаванай адказнасцю «Палессе» - прадпрыемства па вытворчасці цацак з пластмасы. Яго бізнес, які быў арганізаваны разам з Уладзімірам і ПятромКівакамі, пачынаўся з саматужнай вытворчасці на арандаваных у праектнай арганізацыі плошчах. Першапачатковая колькасць калектыву складала ўсяго 10 чалавек, а першай прадукцыяй стала каляровая пірамідка. Паступова, з году ў год, павялічваліся вытворчыя плошчы, удасканальвалася тэхналогія, рос асартымент прадукцыі.

Сёння «Палессе» - найбуйнейшы ў Беларусі вытворца цацак з пластмасы, які добра вядомы не толькі ў Кобрыне і рэгіёнах Беларусі, але і далёка за межамі краіны. Прадпрыемства вырабляе высакаякасныя дзіцячыя пластмасавыя цацкі з экалагічна бяспечных матэрыялаў з выкарыстаннем перадавых тэхналогій і прадукцыю гаспадарча-бытавога прызначэння з пластмасы ўласнай вытворчасці. Прадукцыя прадпрыемства карыстаецца попытам на ўнутраным і знешным рынках.

СТАА «ВП «Палессе» актыўна развіваецца ў сферы гандлю Кобрынскага раёна. У жніўні 2014 года прадпрыемствам адкрыты гандлёвы цэнтр «Палессе», які ўяўляе сабой сучасны гандлёвы комплекс - тры паверхі з гандлёвымі заламі харчовых і прамысловых тавараў, дзе

пакупнікі маюць магчымасць набыць шырокі асартымент тавараў, сканцэнтраваных у адным месцы пры высокім узроўні абслугоўвання насельніцтва.

Андрэй Міхайлавіч – высокакваліфікаваны, ініцыятыўны кіраўнік, з'яўляецца адным з уласнікаў магутнага вытворчага прадпрыемства з абмежаванай адказнасцю «ВП Палессе», і пад яго кіраўніцтвам прадпрыемства дасягнула высокіх эканамічных і вытворчых паказчыкаў. У 2021 годзе фабрыка «Палессе» стала лаўрэатам прэміі ў галіне якасці. Прэмія прысуджана прадпрыемству за дасягненне значных вынікаў у галіне якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі, укараненне інавацыйных тэхналогій і сучасных метадаў менеджменту.

А. М. Гольцман прымае актыўны ўдзел у жыцці горада і раёна. У 2010 годзе прымаў удзел ў IV Усебеларускім народным сходзе. СТАА «ВП Палессе» ў апошнія гады стала асноўным горадаўтваральным прадпрыемствам. За сродкі прадпрыемства пабудаваны ўчастак дарогі па вуліцах Чалюскінцаў, Мікалаева, сучасны гандлёвы комплекс «Палессе», стаянка на 300 паркавачных месцаў. Рэгулярна праводзяцца дабрачынныя акцыі ў Кобрынскім дзіцячым доме, парку імя А. В. Суворава, арганізоўваюцца святы і для дзяцей, і для дарослых.

За час працоўнай дзейнасці прафесіяналізм А. М. Гольцмана адзначаўся на самым высокім узроўні. Па выніках 2010 года «Палессе» на раённым і абласным узроўнях удастоена ганаровага звання «Лепшы прадпрымальнік-мецэнат». «Чалавек года 2011» Брэсцкай вобласці (2012). У 2014 годзе яму аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 2015 годзе Андрэй Міхайлавіч як уплывовы і паспяховы бізнесмен увайшоў у ТОП-50 бізнесменаў Брэсцкай вобласці.

Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў ад 20 чэрвеня 2017 года № 155 за асабісты ўклад у развіццё эканомікі раёна і грамадскую дзейнасць Гольцману Андрэю Міхайлавічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Кобринский** район. Совместное предприятие «ПП Полесье» // Брестчина производит, предлагает, приглашает : каталог-справочник / отдел внешней торговли, коммунальной промышленности и торговли Брестского облисполкома, Предприятие «Техн. Центр-88». - Барановичи, 2004. - С. 152.

**Лешкевич, А. А**. СООО «ПП Полесье» / А. А. Лешкевич // Мая Радзіма – Беларусь / А. А. Лешкевич. - Брэст, 2008. – С. 108-110.

**Совместное** общество с ограниченной ответственностью «ПП Полесье» // Предпринимательство Брестчины / сост. Управление предпринимательства комитета экономики Брестского облисполкома. - Брест, 2011. - С. 12 : фот.

**Гольцман Андрэй Міхайлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – 2 -е выд., дап. – Кобрын, 2020. – С. 39-40 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**55 гадоў** з дня нараджэння А. М. Гольцмана (1970) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С.166.

**Вытворцы** дзіцячай радасці : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 25-годдзя з часу заснавання СТАА «ВП Палессе» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; складальнік С. Д. Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2023. – 56 с. : фат. – (Серыя «З гісторыі прадпрыемстваў горада»).

**Сацута, А. Н.** Инновационно активный регион / Алена Сацута ; фото Александра Шульгача // Заря. - 2025. — 16 августа (№ 64). — С. 3 : фот.

Председатель Правления Национального банка Республики Беларусь Р. А. Головченко посетил СООО “ПП Полесье” в рамках проекта "Новые чемпионы".

**Елизарова Ж.** Здесь видят и ценят / Жанна Елизарова ; фото: Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2023. — 30 снежня (№ 74). — С. 7 : фот.

Состоялось юбилейное торжество, посвященное 25-летию СООО "ПП Полесье".

**Курачук, С.** История кобринского края в лицах : Почётный гражданин Кобринского района / страницу подготовила Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2021. – 26 августа (№ 34). – С. 4. – Продолжение. Начало в № 12, № 17, № 21, № 25, № 30.

Очередная страница совместного проекта Кобринской центральной районной библиотеки и газеты "Кобрин-информ" посвящена почётным гражданам Кобринского района А. Гольцману, С. Чирун, Н. Кенде, П. Папроцкому.

**Гольцман, А**. Горад, дзе збываюцца мары / Андрэй Гольцман // Кобрынскі веснік. – 2019. – 20 ліпеня. – С. 3.

**Курачук, С.** Достойным - почётное звание! / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2018. – 6 декабря (№ 49). – С. 4.

Продолжением проекта Кобринской центральной районной библиотеки «Славутыя імёны маёй малой радзімы» стало издание биобиблиографического справочника «Імі ганарыцца Кобрыншчына» и создание полнотекстовой базы данных «Ганаровыя грамадзяне Кобрынскага краю».

**Гольцман, А.** Дарить радость детям / [Андрей Гольцман ; беседовала] Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 15 ліпеня. — С. 3.

**Гольцман, А. М.** Дарить радость детям / [Андрей Гольцман ; беседовала] Елена Бакун // Государственный контроль. - 2017. - № 2. - С. 80-82.

Беседа с директором СООО «ПП Полесье» А. М. Гольцманом.

**Гольцман, А. М**. Страна игрушек: столица - Кобрин / [Андрей Гольцман ; беседовала] Оксана Кузнецова // Экономическая газета. - 2017. - 17 февраля. - С. 1, 3.

Беседа с директором СООО «ПП Полесье» А. М. Гольцманом об истории успеха кобринского предприятия.

**О присвоении** звания «Почетный гражданин Кобринского района» : решение Кобринского районного Совета депутатов, 20 июня 2017 г., № 155 // Кобрынскі веснік. – 2017. – 28 чэрвеня. – С. 1.

**Они** славят Кобринщину трудом // Кобрин-информ. - 2017. - 20 июля. - С. 2.

Звание «Почетный гражданин Кобринского района» присвоено А. Гольцману и С. Чирун.

**Гольцман, А.** Андрэй Гольцман: "У мірны час здзяйсняюцца ўсе мары!" / [Андрэй Гольцман ; запісў] Р. Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2015.— 18 ліпеня. — С. 4.

А. Гольцман, дырэктар СТАА «ВП Палессе» - аб гісторыі прадпрыемства, яго сённяшнім дні і перспектывах.

**ТОП-50 бизнесменов** Брестской области // Кобрин-информ. - 2015. – 8 января. - С. 3.

В число успешных вошли бизнесмены из Кобрина: на 16 строчке - Андрей Гольцман.

**Рубашевский, Ю**. «Вся республика пытается угнаться за Брестчиной» / Юрий Рубашевский // Вечерний Брест – 2014. – 23 апреля ( № 33 ) – С. 5.

А. Гольцман, директор СООО «ПП Полесье», лауреат премии правительства Республики Беларусь за достижения в области качества по итогам работы за 2013 год.

**Андрей** Гольцман - "Человек года" за 2011 год // Кобрынскі веснік. - 2012. - 25 красавіка. - С. 1 ; Народная трыбуна. - 2012. - 27 красавіка. - С. 2 ; Заря. - 2012. - 3 мая. - С. 4 ; Брестский вестник. - 2012. – 10 мая. - С. 6.

**Кондрашук, Н**. «Мне работа даже снится» / Наталья Кондрашук // Кобрин – информ. – 2012. – 24 мая. – С. 2.

По итогам за 2011 год звание «Человек года» присвоено директору СООО «ПП Полесье» А. Гольцману.

**Гольцман, А**. «Родны горад хочацца падтрымліваць заўсёды» / Андрэй Гольцман // Кобрынскі веснік. - 2011. – 16 ліпеня. - С. 3.

Па выніках 2010 года «Палессе» на раённым і абласным узроўнях удастоена ганаровага звання «Лепшы прадпрымальнік-мецэнат».

**Избраны** делегаты IV Всебелорусского народного собрания // Кобрынскі веснік. -2010. - 9 ноября.

Гольцман Андрей Михайлович, директор СООО «ПП Полесье», избран от Кобринщины делегатом на IV Всебелорусское народное собрание.

**Лепшыя** прапрымальнікі Кобрыншчыны // Кобрынскі веснік. - 2009. - 15 ліпеня. - С. 1.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адзначаны лепшыя прадпрымальнікі, сярод якіх дырэктар “ПП Палессе” А. Гольцман.

**Гольцман, А.** «Для таго, каб утрымліваць лідэрскую пазіцыю, трэба адчуваць надзейны тыл – калектыў» / Андрэй Гольцман // Кобрынскі веснік. – 2007. – 10 студзеня – С. 4.

Прадукцыя «Палесся» канкурэнтаздольная не толькі на ўнутраным рынку, але і паспяхова пастаўляецца ў 24 краіны свету.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Кобрын

***Установы:***

Кобрынская фабрыка «Палессе»

***Імёны:***

Гольцман Андрэй Міхайлавіч

***Прадметы:***

Ганаровыя грамадзяне

Прадпрымальнікі

Кіраўнікі вытворчасці